Таццяна Даменікан



Дырэктар
Клімавіцкай
бібліятэчнай сеткі

# КНІГА ТВОРЧАСЦЬ ВЕДЫ

Сучасная бібліятэка сёння – гэта не проста абанемент і чытальная зала, а цэлы комплекс паслуг, здольны зацікавіць самага патрабавальнага наведвальніка. Таму прыклад – Клімавіцкая гарадская бібліятэка № 1, якая з'яўляецца неад'емнай часткай жыцця мікрараёна нашага горада.

Сваю культурна-асветніцкую дзейнасць бібліятэка пачала ў далёкім 1949 г. Вось ужо больш за 70 гадоў яна адкрывае дзверы для сваіх добрых чытачоў – людзей розных узростаў, прафесій, інтарэсаў. Акунуцца ў разнастайны кніжны свет і выбраць упадабаную кнігу для душы ці творчасці заўсёды дапамогуць добразычлівыя бібліятэкары Алена Віктараўна Севярынава і Ганна Іванаўна Цыганкова. Ім удалося рэалізаваць разнапланавыя культурныя праекты, якія не толькі пашырылі межы прафесійнай дзейнасці, але і спрыялі прыцягненню жыхароў раёна да чытання.

Звыш 25 гадоў радуе клімаўчан літаратурнае аб'яднанне «Кнігалюб». Тут можна адпачыць усёй сям'ёй. Бібліятэкары запрашаюць на пасяджэнні рознай тэматыкі: дні сямейнага чытання, лабараторыі творчасці, вечары духоўнай культуры, літаратурныя гадзіны і кампазіцыі. Часцей за ўсё на сустрэчы прыходзяць мамы з дзецьмі. Але супрацоўнікі стараюцца, каб сямейную гасціную наведвалі і іншыя члены сям'і. Так, на вечары адпачынку «Наша дружная семья» разам з унукамі пабывалі дзядулі і бабулі. А сваіх бацькоў дзеці прыводзілі на святы «Чтение для хорошего настроения» і «Лекарство от скуки – журнал в руки». І дзеці, і дарослыя выходзяць з бібліятэкі ў выдатным настроі. Яны абавязкова атрымліваюць новыя веды і невялікія падарункі.

Нашы спецыялісты традыцыйна збіраюць, захоўваюць і папулярызуюць творчасць мясцовых аўтараў, актыўна ўдзельнічаюць у культурным жыцці раёна. Яны арганізуюць шматлікія мерапрыемствы з прыцягненнем клімавіцкіх паэтаў: М. Мінчанку, Г. Цыганкову, У. Босава. Сама бібліятэкар Ганна Цыганкова (творчы псеўданім – Жылінская) піша добрыя вершы. Яна з'яўляецца аўтарам двух літаратурных зборнікаў. Штогод прымае ўдзел у рэгіянальных святах і міжнародных праектах: фестывалі самадзейнай мастацкай творчасці «Порубежье» ў г. п. Шумячы Смаленскай вобласці, расійскім фестывалі духоўнай песні «Дорогою добра», рэгіянальным свяце «Вянок Аляксею Пысіну» ў г. п. Краснаполле, рэгіянальным




Удзельнікі літаратурнага аб'яднання «Кнігалюб»

сваце паэзіі і аўтарскай песні «Пісьмянкоў луг» у г. Касцюковічы. І мы ганарымся сваёй паэтэсай.

Менавіта гарадская бібліятэка стала пляцоўкай для рэалізацыі сістэмнай праграмы «Молодежь и библиотека: навстречу друг другу». Галоўны акцэнт зроблены на падрастаючае пакаленне – самую актыўную, дапытлівую і мабільную катэгорыю чытачоў. Для іх створаны інфармацыйны цэнтр «Вектор молодежного чтения». Адкрыццё цэнтра адбылося з удзелам старшыні Маладзёжнага парламента пры Клімавіцкім раённым Савеце дэпутатаў Ірыны Шашковай і першага сакратара райкама БРСМ Алесі Котавай.

Актыўна працуе клуб «Молодежный серпантин», дзе разглядаюцца пытанні прававога, грамадзянска-патрыятычнага, краязнаўчага характару, здаровага ладу жыцця. Выкарыстоўваюцца самыя разнастайныя формы работы: інтэлектуальныя гульні, турніры знаўцаў, дыспуты «Молодежные предпоЧТЕНИЯ», сустрэчы з цікавымі людзьмі, PR-акцыі, святы роднай мовы. Такія сустрэчы не толькі дазваляюць цікава правесці час, але і фарміруюць новы вобраз бібліятэкі ў вачах маладых людзей: не сумная і ціхая ўстанова, а сучасны маладзёжны інфармацыйны цэнтр.

Пазнавальны квэст «Бібліядэсант» прайшоў пад дэвізам «Моладзь чытае». Бібліятэкары пастараліся ахапіць як мага больш моладзевай аўдыторыі і расказаць падлеткам аб новых цікавых кнігах. Яны наведалі сельскія Дамы культуры, раённы цэнтр культуры, сярэднія школы горада з творчай праграмай. Так, незвычайнымі і прывабнымі аказаліся для моладзі выстава-інсталяцыя «Библиотечный чемодан “Вперед за новой книгой!”», рэтра-вечар у стылі 80-х гг., літаратурныя гонкі «Вялікі кніжны шлях».

Моладзь актыўна прымае ўдзел у ваенна-патрыятычных мерапрыемствах. Разам з бібліятэкарамі дзяўчынкі і хлопчыкі падрыхтавалі тэатралізаванае прадстаўленне паводле аповесці Б. Васільева «А зори здесь тихие». Праводзяцца літаратурныя марафоны «Не забывайте грозные года», патрыятычныя квэсты «Победа в моем сердце», акцыі «Читаем книги о войне».

Развіваць у чытачоў цікавасць да літаратуры, мовы, культуры і гісторыі беларускага народа спрыяе літаратурны праект «Беларуская скарбонка». Тут і шматлікія мерапрыемствы да юбілеяў беларускіх пісьменнікаў, і фальклорныя сустрэчы, і турніры знаўцаў вуснай народнай творчасці, акцыі, прысвечаныя роднай мове і захаванню нацыянальнай спадчыны.

Ярка і насычана прайшоў творчы конкурс «Міс Беларусачка». Удзельніцы паказалі свае веды аб нашай краіне, яе сімвалах, гістарычных месцах. Асаблівую радасць дзецям прыносіць цырымонія ўзнагароджання пераможцаў штогадовага конкурсу «Лепшы чытач беларускай кнігі!».

Кожнае мерапрыемства суправаджаецца тэатралізацыяй. І супрацоўнікі вырашылі адрадзіць бібліятэчны праект «Магія тэатра і кнігі». Тэатр – гэта цудоўная магчымасць ажывіць літаратурнага героя і выклікаць у наведвальнікаў бібліятэкі жаданне прачытаць кнігу, а прадстаўленне зрабіць ярчэйшым і прыгажэйшым. Бібліятэкары выступаюць у ролі сцэнарыстаў, акцёраў і касцюмераў. Асаблівай папулярнасцю карыстаюцца інсцэніроўкі па матывах беларускіх казак, тэатралізаваныя прадстаўленні ў час правядзення тыдня дзіцячых кніг, лялечныя прадстаўленні. Так, чытачы з задавальненнем глядзелі інсцэніроўку купалаўскай «Паўлінкі», якую падрыхтавалі бібліятэкары разам са сваімі актывістамі. Спадабалася і тэатралізаванае прадстаўленне па матывах казкі «Жаронцы».



Інсцэніроўка па матывах беларускіх казак

А якія гульнявыя праграмы ладзяцца ў дзіцячых садках «Ялінка» і «Рамонак»!

У забаўляльнай форме дашкольнікі знаёмяцца з бібліятэкай, лепшымі творамі сусветнай дзіцячай літаратуры, беларускімі народнымі традыцыямі, расказваюць аб навакольным асяроддзі. Для самых маленькіх арганізоўваюцца літаратурныя падарожжы па кнігах дзіцячых пісьменнікаў «Жыла-была кніжка», калейдаскопы добрых парад «Урокі Чырвонай Шапачкі», тэатралізаваныя прыгоды «Страна конфет или Великое сладкое приключение». Вось так рэалізуецца праект на тэму «Разам з кніжкай мы расцём».

Кожнае лета бібліятэка прыцягвае сваіх карыстальнікаў да актыўнага ўдзелу ў праграме летняга чытання «Лета кнігамі сагрэта». Конкурсы, гульні, прыгоды, падарожжы і падарункі дазваляюць зрабіць вольны час дзяцей не толькі цікавым, але і карысным. Супрацоўнікі з асаблівай руплівасцю падбіраюць і рыхтуюць мерапрыемствы, каб дзеці не сумавалі, а былі заняты карыснымі і цікавымі справамі, гуляючы, развіваліся. Праводзяцца пазнавальныя праграмы «Каникулы. Чтение с увлечением», літаратурныя вандроўкі «На сказочной поляне Лукоморья», літаратурныя дэгустацыі «Выбіраем смачную кнігу!», літаратурныя сустрэчы з героямі дзіцячых кніг В. Віткі, Я. Маўра, П. Місько, У. Ягоўдзіка, М. Носава, А. Барто, Г.Х. Андэрсэна і інш. Бібліятэкары арганізавалі ў парку бібліядворык «Мы хотим, чтобы ваше лето было книгами согрето» і PR-акцыю «Молодежь на книжной волне». Тут можна не толькі пачытаць кнігі і часопісы ў камфортных умовах на свежым паветры, але і прайсці тэст на хуткасць чытання, намаляваць любімага персанажа, намінаваць любімую кнігу на званне «Кніжная сімпатыя», сабраць пазлы, сфатаграфавацца на памяць з кнігай.

Творчы праект «Мастерская радости» праз інтэграцыю кнігі, гульні і мастацтва дае магчымасць дзецям паказаць свае таленты, развіць творчыя здольнасці, самарэалізавацца. У бібліятэцы творча праходзяць майстар-класы «Фарбы малююць казкі», «Волшебство из бумажных трубочек», творчая майстэрня «Зимушка-зима к нам в гости пришла», акварэльная паляна «Детские руки творят чудеса», творчыя гадзіны «Восеньскія забавы», урокі рукадзелля па вырабе закладак «Волшебный стежок».

У сваёй бібліятэчнай віртуальнай прасторы (старонкі ў сацыяльных сетках ВКонтакте, Instagram) установа актыўна знаёміць падпісчыкаў з навінамі кніжнага і калякніжнага свету, рэкамендуе менавіта той кантэнт, што карысна чытаць, вывучаць, слухаць і глядзець. Ажыццяўляецца гэта праз стварэнне сеткавых праектаў, якія працуюць пад дэвізам «Не выходи из библиотеки: будь online!». Супрацоўнікі праводзяць анлайн-гульні і літаратурныя анлайн-конкурсы. Напрыклад, дыстанцыйны праект «Минутка поэзии» знаёміць з літаратурнай спадчынай пісьменнікаў-землякоў. Рубрыка «ПроКниги_деткам!» запрашае ў анлайн-госці юных чытачоў, якія выразна і прыгожа чытаюць услых творы беларускіх аўтараў. Яшчэ адна рубрыка #ЖурФреш «Смотри, выбирай и читай!» знаёміць з часопісамі для дзяцей і дарослых. Сеткавая акцыя «Память о войне» прыцягвае ўвагу чытачоў да кніг пра вайну.

Бібліятэкары вядуць пошукавую і даследчую работу па зборы матэрыялаў аб гісторыі роднага горада, ладзяць сустрэчы з цікавымі людзьмі. Вынікам праекта «Захаваем сваю гісторыю» стала стварэнне гісторыка-краязнаўчага альбома «Комбинат строительных материалов: история, события, даты» з фотаздымкамі і архіўнымі дакументамі. Бібліятэкары склалі гістарычную даведку аб важнейшых этапах развіцця Клімавіцкага камбіната будаўнічых матэрыялаў, які быў самым першым прадпрыемствам у Беларусі па вырабе сілікатнай цэглы, запісалі ўспаміны людзей аб працоўных подзвігах работнікаў камбіната. Краязнаўчы летапіс актыўна выкарыстоўваецца пры правядзенні мерапрыемстваў.

Вось такім чынам праз адраджэнне традыцый сямейнага чытання, гарманічнае зліццё кнігі з магіяй тэатра і мастацтва, сістэмную рэалізацыю праграм і праектаў, заснаваных на спрадвечных беларускіх каштоўнасцях і звернутых на прыцягненне ўвагі да айчыннай літаратуры, інтэрактыўныя зносіны на тэму кнігі і чытання ў інтэрнэт-прасторы ладзіцца мэтанакіраваная дзейнасць Клімавіцкай гарадской бібліятэкі № 1 па стымуляванні чытацкай актыўнасці, развіцці чытацкай кампетэнтнасці і павышэнні якасці чытання. І робіцца гэта з акцэнтам на падрастаючае пакаленне – самую актыўную, дапытлівую і мабільную катэгорыю чытачоў – будучыню нашай краіны.

Summary

The article presents the activities of the city library No. 1 of Klimovichi.